Сяргей БАЛАХОНАЎ

БЕЗ СТА ГАДОЎ НА РАЗГАДКУ



Сяргей Балахонаў нарадзіўся 24 красавіка 1977 года ў вёсцы Свяцілавічы Веткаўскага раёна. Празаік, паэт, музыка, блогер, гісторык па адукацыі. Аўтар кніг прозы «Імя грушы» (2005) і «Зямля пад крыламі Фенікса» (2012).

1

Гледачы не маглі стрымацца ад узрушаных крыкаў, падтрымліваючы сваіх фаварытак у заплыве вольным стылем на тысячу пяцьсот метраў. Пераважную большасць прысутных складалі не проста аматары гэтага віду спорту, а так ці інакш знаёмыя з удзельніцамі спаборніцтваў. Таму глядацкая ўзрушанасць дасягала вельмі высокага градуса. Плыўчыхі імкліва рухаліся па дарожках басейна. Ці не кожная з іх разлічвала на перамогу. Неўзабаве пасля старту вызначыліся рэальныя прэтэндэнткі на першае месца. З трыбунаў грымелі акурат два імені: Света і Насця. Яны здолелі пайсці ў адрыў ад сваіх суперніц. Плылі, не адстаючы адна ад адной і яўна не збіраючыся саступаць. Тое, што трыбуны равуць, яны чулі. Але для іх гэта гучала толькі як водгулле накшталт далёкага рэха. Дзяўчыны былі засяроджаныя на заплыве, намагаліся не зважаць на воклічы прыхільнікаў. Нават найменшая ўвага, звернутая не ў той бок, магла фатальна адбіцца на выніках.

І вось апошнія сто метраў. Напружанне ўзрастала. Крыкі гледачоў не сціхалі. Света і Насця па-ранейшаму плылі ўпоравень. Здавалася, што толькі цуд зможа раптоўным чынам змяніць гэтае становішча. Але цуду не адбылося — дзяўчаты фінішавалі амаль адначасна. Каб высветліць рэальнага пераможцу, суддзі мусілі звяртацца да здымкаў фотафінішу. І пакуль трыбуны наўзахват выгуквалі імёны стомленых і крыху збянтэжаных дзяўчат, суддзям даводзілася вырашаць, хто ж з дзвюх плыўчых атрымае першае месца. Урэшце праз рэпрадуктары было абвешчана, што пераможцам спаборніцтва стала Святлана Даброўская. Гледачы прывіталі яе авацыямі. Дзяўчына радасна ўсміхнулася, выкрыкнула «дзякуй» і памахала рукой прыхільнікам. Яе суперніца тым часам пачувалася вельмі ніякавата. Так, яна заняла другое месца. Прычына для радасці, здаецца, і была. Аднак усмешка на твары Насці Навіцкай (такім было прозвішча другой прэтэндэнткі на перамогу) выглядала нейкай скамечанай, не дужа натуральнай. Дый адкуль тут узяцца натуральнасці, калі да пераможнага месца плыўчысе не

хапіла ўсяго некалькі сотых долі секунды! Да таго ж было вядома, што па выніках спаборніцтваў на прэстыжны турнір у Нямеччыне паедзе толькі заваёўніца першага месца. Крыўдна да слёз. Насця, тым не менш, старалася стрымаць позыў да плачу. У той жа час Света на слёзы не скупілася. Але ж, ведама, гэта былі слёзы радасці.

Спаборніцтвы скончыліся. Неўзабаве плыўчыхі выйшлі на вуліцу. Большасць гледачоў паспела разбрысціся па сваіх справах. І толькі лічаныя адзінкі чакалі сваіх фаварытак. Даброўская, усміхаючыся, выйшла з будынку басейна. Яе ўсмешка заззяла яшчэ больш, калі дзяўчына згледзела свайго хлопца. Той стаяў непадалёк ад выхаду з вялікім букетам ружаў. «Вунь твой Арцём. Шанцуе ж табе, Светка», — без пільнай патрэбы заўважыла адна з плыўчых. У голасе адчуваліся мала прыхаваныя ноткі зайздрасці. Света пакрочыла насустрач хлопцу, які цёплым пяшчотным позіркам лавіў кожны яе рух. Праз імгненне вусны дзяўчыны і яе сябра з'ядналіся ў непрацяглым, але жарсным пацалунку. Гэта не засталося па-за ўвагай іншых дзяўчат. «Воў-воў, каханачкі, лягчэй трохі», — паўжартам выгукнуў нехта з іх. Групка выбухнула задзірыстым смехам, хваля якога міжволі накрыла і рамантычную пару. «Зайздросці моўчкі!» — кінула ў адказ пераможца, трымаючыся жартаўлівага тону. Хлопец ніяк на гэты абмен рэплікамі не адрэагаваў. Ён павіншаваў сваю дзяўчыну з пераможным першым месцам і ўручыў ёй кветкі. Тая ласкава абняла яго, але праз секунду яе чамусь перасмыкнула, і яна рэзка адхінулася.

— Што здарылася? — не разумеючы прычын для гэтага, спытаў Арцём.

— Нічога. Але… — збянтэжана прамармытала дзяўчына.

— Што — «але»? — не сунімаўся сябар.

— Мне здалося, што нехта за намі назірае збоку, — патлумачыла яна.

— Ну, гэта магчыма, — усміхнуўся ён. — Нехта з тваіх таварышак ці, можа, які заўзятар загледзеўся.

— Магчыма, — яна згодна хітнула галавой. — Проста я адчула сябе вельмі няўтульна. Нібыта мяне няшчадна свідруюць позіркам.

Яны разам агледзеліся. Нічога падазронага не прыкмячалася. Калі сапраўды нехта і кінуў на іх благім вокам, то ён паспеў сысці. Зрэшты, назіраць маглі і з вокнаў бліжэйшага да басейна шматпавярхоўіка. Не жадаючы развважаць на гэтую тэму, пара рушыла на аўтобусны прыпынак.

У дарозе Свету прыспела тэлефанаванне. Званіў яе тата. Ад сябе і ад мамы павіншаваў з перамогай, адразу ж патлумачыў, што пра гэта пачулі ў навінах мясцовай радыёстанцыі. Адначасова пашкадаваў пра тое, што не давялося самому прысутнічаць на даччыным трыумфе. Ён разам з жонкай акурат збіраўся ў паездку. Меркавалі на пару дзён з'ехаць у Вільню, каб вырашыць там пэўныя бізнес-пытанні, а заадно і трошкі развеяцца. Даведаўшыся, што дачушка ідзе не адна, тата не прамінуў запрасіць Арцёма ў госці. Каго-каго, а Цёму ў сям'і Даброўскіх ведалі даўно, давяралі яму і ўспрымалі няйнакш як будучага зяця. Такая думка задавальняла ўсіх. Хаця сам хлопец іншым разам саромеўся гэтага даверу.

Як толькі пара з'явілася ў кватэры Даброўскіх, мама Светы паспяшалася накрыць на стол. Чарговыя віншаванні па-свойску перапляліся з зычаннямі «Смачна есці!». Дзеці, а толькі так іх тут і называлі, паглыналі смачны чырвоны боршч і слухалі, што ім кажуць дарослыя. Тыя ўжо былі гатовыя да ад'езду і аддавалі апошнія наказы. Паводзіць сябе прыстойна. Не забываць харчавацца. І ўсё такое гэтакае. Потым Свеціны бацькі замоўклі, замілавана пагляджелі на дзяцей і пачалі развітвацца, просячы не праводзіць. Тата нахіліўся да Арцёма і нешта прашаптаў яму на вуха. Хлопец міжволі пачырванеў, ажно па колеры мог скласці канкурэнцыю згаданаму баршчу. Відаць, бацькі здагадваліся, што паміж іх дачкою і яе сябрам нешта

большае, чым проста сяброўства. Мужчына пахлопаў яго па плячы. Пасля кароткага развітання «радакі» сышлі. Дзяўчына і яе сябар хвілін пяць сядзелі за сталом, думаючы, ці варта пераходзіць да катлет з макаронамі. Урэшце перамагло зусім іншае жаданне.

2

Наступным ранкам спяшацца не было куды. Субота ёсць субота. А па суботах Света трэніровак не мела. Арцёму ж трэба было ісці на трэніроўку па баскетболу. Але гэта яшчэ толькі ўдзень. Здавалася, што ў гэтай пары мелася дастаткова шмат часу, каб пабыць разам. Дзяўчына паводзіла сябе так, як мусіла б сябе паводзіць клапатлівая закаханая гаспадыня. На сняданак яна згатавала амлет з сырам, падсмажыла тосты, зрабіла кавы з малаком. Сябар, калі б і не любіў чагось з гэтага, усё адно б аблізаў пальчыкі. За ноч добра згаладаўся. Дый крыўдзіць каханую дзяўчыну ніяк не жадаў.

Праглынуўшы сняданак, з кубкамі недапітай яшчэ кавы хлопец і дзяўчына скіраваліся да камп'ютара. Света зайшла ў інтэрнэт і пасунула клавіятуру да Арцёма.

— Давай, Казімірчык, адчыняй «кантакцік», — прамовіла яна, называючы хлопца па прозвішчы.

Той пасміхнуўся, перайшоў на адпаведную старонку вядомай сацыяльнай сеткі і ўвёў належныя дадзеныя.

— Зараз мы пабачым, колькі табе дзевак тут панапісвала ды фотачак «налайкала», — жартаўліва заўважыла Даброўская, пазіраючы на манітор.

— Ой, ды ўсе ведаюць, што мы з табой сустракаемся, дык даўно перасталі і пісаць, і «лайкаць». Хіба толькі па справах якіх могуць звярнуцца. А так не, — з усмешкай адрэагаваў баскетбаліст.

І сапраўды на ягонай старонцы панавала поўная цішыня. Ніводнага новага паведамлення. Ніводнага каментара на сцяне. Ніводнага новага «лайка» ў фотаальбомах. Хлопец пераможна зірнуў на сяброўку і сказаў:

— А вось у цябе там зараз будзе «стопяццот» паведамленняў, куча «коментаў», дый «лайкаў» як дроў у лесе.

— Ну, што ўжо зробіш, — сціпла адказала тая, цягнучы клавіятуру на сябе.

Арцём меў рацыю. Але збольшага толькі таму, што Свеце на яе старонку прыйшло шмат віншаванняў з нагоды перамогі ў спаборніцтвах. Праўда, сярод прыватных паведамленняў знайшліся і два, на якія баскетбаліст звярнуў асаблівую ўвагу.

— Зноў табе дарослыя мужыкі пішуць? — стараючыся казаць бадзёра, спытаўся ён, хаця ўнутры ўжо кіпеў.

— Ай, кінь ты раўнаваць! — гарэзліва выгукнула плыўчыха і злёгку тыцнула яго кулачком у плячо.

Ён зрабіў выгляд, быццам пажартаваў. Святлана ўзялася чытаць паведамленні ад тых, каго каханы назваў дарослымі мужыкамі. Папраўдзе аднаму было 30, а другому 25 гадоў. Першы — яе настаўнік гісторыі. Другі — фатограф, з якім пазнаёмілася ў сацыяльнай сетцы. Яна патлумачыла гэта Арцёму.

— І што пішуць? — стрымана ўдакладніў ён, каб крый божа зноў не засведчыць перад дзяўчынай сваю рэўнасць.

— Гісторык турбуецца, што я шмат прапусціла, — стала пераказваць змест паведамлення яна. — Пытаецца, ці не маю сёння часу і жадання, каб адпрацаваць хаця б

пару параграфаў. Ён клёвы дзядзька. З разуменнем ставіцца да вучнёўскіх праблем. Так… Факультатыў сёння з гадзіны да дзвюх. Можа, і сапраўды падысці?

— Як сабе хочаш. Але ты наўрад ці зараз здолееш дзве тэмы вывучыць, — скептычна прамовіў сябар.

— Ну, там пабачым, — як нічога ніякага выдала Света, пераходзячы да паведамлення ад фатографа.

Той прапаноўваў ёй зладзіць фотасесію ў яго хатняй студыі. Да таго ж, у самы бліжэйшы час. Гэта напружыла Арцёма. Сяброўка ведала фатографа ўсяго пару тыдняў і толькі завочна. Ніколі не бачыла яго жыўцом. Агульных знаёмых, якія маглі б нешта расказаць пра яго, у іх не было. Хлопец падцягнуў клавіятуру ў свой бок, перайшоў на старонку фатографа і адразу ж саркастычна чмыхнуў.

— Нікас Сулімаў? Гэта яго так сапраўды завуць? — удакладніў ён у дзяўчыны.

— А бог яго ведае, — пацiснула яна плячыма. — Здаецца, што на ўсіх здымках, якія ён выкладае ў сябе на старонцы, стаіць акурат такі подпіс.

Казімірчык паспяшаўся зайсці ў фотаальбомы Сулімава. Стаў наўздагад адкрываць некаторыя з іх і хуценька пераглядаць змешчаныя там фатаграфіі. Звонку было цяжка зразумець, што так турбавала хлопца. Урэшце ён выдаў заўвагу:

— Нешта ў яго мадэлькі ўсе аднатыпныя. Падобныя між сабой.

Даброўская паматляла галавой, даючы зразумець, што яна не ў курсе гэтага і нават ніколі не задумвалася. Сябар жа насамрэч толькі бегла пазіраў на твары сфатаграфаваных Нікасам дзяўчат. Яго заклапочанасць палягала ў іншым — ён спрабаваў высветліць, ці не робіць фатограф адмысловых фотасесій у жанры ню. Аднак, колькі яму ні давялося пераглядзець альбомаў (і пры гэтым удаваць абыякавасць!), усе адлюстраваныя на здымках мадэлі былі апранутымі.

— Ну, дык ты пойдзеш да яго? — закрываючы чарговы выпадковы альбом, удакладніў Арцём.

— Хочацца схадзіць, — зусім па-дзіцячы вымавіла дзяўчына. — Ён хоць нармальныя фоткі зробіць. А то што ў мяне тут…

Усё выглядала на тое, што ў дзяўчыны яшчэ не мінула эйфарыя ад перамогі на спаборніцтвах, якая перапляталася са зразумелым дзявочым жаданнем пакрасавацца. Пагатоў, работы фатографа выглядалі прафесійна, і можна было чакаць выразных, насычаных эмоцыямі, здымкаў.

— Ясна, — як мага больш нейтральна адрэагаваў баскетбаліст і тут жа дадаў яшчэ адно пытанне: — А да гісторыка таксама пойдзеш? Ён, дарэчы, зараз онлайн з тэлефона.

— Напішы, што я прыйду а трынаццатай гадзіне, каб проста паразмаўляць, — каб даць сябру лішні раз адчуць сябе гаспадаром становішча і збіць чарговую кепска прыхаваную хвалю рэўнасці, папрасіла Света.

Ён так і зрабіў, сапраўды адчуўшы ад гэтага пэўную палёгку. Настаўнік адказаў вельмі хутка, напісаўшы: «Прыходзь. Буду чакаць». Дзяўчына ўсміхнулася, быццам не проста прачытала адказ, а ўбачыла перад сабой настаўніка. Арцём скасавурыўся на яе і задаў чарговыя пытанні, нібыта ад пустое цікаўнасці:

— Як яго хаця б завуць, гэта твайго клёвага дзядзьку? І чаму ён падпісаны як «Horacio Oliveira»?

— Ён Віктар Андрэевіч. А нік сабе ўзяў па імені героя свайго любімага рамана, — растлумачыла плыўчыха і зноў, нібы няўзнак, адзначыла: — Ён сапраўды клёвы. Увойдзе ў становішча.

Апошняя фраза кальнула хлопца, і ён нават збіраўся на гэта кінуць нешта з’едлівае. Але сяброўка, своечасова адчуўшы гэта, прыгарнула яго да сябе і закрыла яму рот пацалункам.

Пацалунак прыкметна разняволіў атмасферу. Толькі пасля гэтага Даброўская адказала фатографу. Пагадзілася на фотасесію, напісаўшы, што можа завітаць да яго сёння ж а чатырнаццатай гадзіне. Той неўзабаве кінуў ёй свой хатні адрас і спасылку на «гугл мапс» з дакладнымі каардынатамі яго дома. Выявілася, што гэта катэдж, які мясціўся ў прыватным сектары за пяць прыпынкаў ад школы. На спадарожнікавых здымках картаў «гугл мапс» можна было разгледзець нават дахоўку, якой быў укрыты яго дом. Дзяўчына адказала, што ўсё зразумела, і разам з тым на радасць свайго хлопца выставіла ўмову: ніякіх здымкаў з «галізной» ці нават намёкаў на іх. Сулімаў запэўніў, што шануе закон, што не стаў бы прасіць нічога падобнага ў непаўналетняй дзяўчыны і бла-бла-бла. Давялося паверыць яму на слова.

— Я заеду туды пасля трэніроўкі і забяру цябе, — не прапанаваў, а паставіў сяброўку перад фактам Арцём. — Спадзяюся, вы ўправіцеся там да пяці вечара.

— Я так сама на гэта спадзяюся, — у чарговы раз усміхнулася Света. — Зараз напішу яму, што ты пад'едзеш.

— Ай, не трэба, — запратэставаў хлопец. — Абыдзецца пан Нікас без тваіх лішніх справаздач.

— Які ж ты ўсё-ткі раўнівы, — не хаваючы ўсмешкі, паўшчувала яго дзяўчына.

Плыўчыха закрыла старонку сацыяльнай сеткі, устала з крэсла і кранулася рукой рукі свайго любага баскетбаліста. Той таксама падняўся са свайго нацепленага месцайка.

— Ведаеш, — какетліва шаптала дзяўчына. — І да майго факультатыву, і да тваёй трэніроўкі яшчэ ёсць час. А гэта значыць, што мы можам…

Яна не змагла дагаварыць, бо яе перабіў гук мабільнага тэлефона. Званіла Насця Навіцкая. Света адразу ж прыняла выклік і ўжо на мігі патлумачыла хлопцу, з кім яна зараз мае размаўляць. Учорашняя суперніца прасіла сустрэцца. Арцём, пачуўшы гэта, прашаптаў: «Ды адпраў ты яе к чорту. Што ёй там яшчэ трэба?» Але сяброўка адмахнулася ад ягоных словаў. Яна выслухала нешматслоўную канкурэнтку і пагадзілася на сустрэчу з ёй, хаця тая толкам не патлумачыла нагоду. Сустрэцца запланавалі каля школы. Але дакладны час не прызначылі. Навіцкая яшчэ не ведала, калі ёй будзе зручней — да гадзіны ці пасля дзвюх. Дамовіліся, што яна патэлефануе Даброўскай у раёне полудня і ўдакладніць. «Ты толькі ўлічы, што я доўга не змагу з табой размаўляць», — папярэдзіла Святлана. Насця адказала, што не бачыць у гэтым праблемы.

Калі гутарка скончылася, Казімірчык стаў папікаць сяброўку за тое, што пагадзілася на гэтую сустрэчу. Ён быў пераканаены, што не да чаго добрага яна не прывядзе. Казаў, што размова канкурэнтак абавязкова перарасце ў спрэчку пра вынік учорашніх спаборніцтваў. Даброўская паабяцала, што сваркі не дапусціць, і пацягнула хлопца да сябе.

3

Па дарозе на трэніроўку Арцём толькі і думаў, што пра свае адносіны са Светай. Сустракацца пачалі яшчэ тады, калі абодва вучыліся ў дзявятым класе. Мінула ўжо больш за два гады. Здавалася, што за такі час можна было расставіць і ўсе кропкі над «і», і пры жаданні нават птушкі над «ў». Ува многім яно так і было. Падлеткавая закаханасць перарасла ў палкае юнацкае каханне. І з першага погляду ўсё выглядала вельмі добра. Толькі парасткі рэўнасці з боку хлопца іншым разам за імгненне ператвараліся ў сапраўдную дуброву. Так, дзяўчына вельмі хутка ўтаймоўвала прыступы яго рэўнасці, але само пытанне нябачна прысутнічала.

Думкі пра рэўнасць і спадарожныя ёй рэчы зніклі, як толькі Арцём узяў мяч. Трэнер пашыхтаваў хлапцоў і абвясціў задачу на сёння, адразу адзначыўшы, што час трэніроўкі зацягнецца хвілін на трыццаць. Праз колькі дзён павінен быў адбыцца нечарговы таварыскі матч з расіянамі, і трэнеру хацелася трохі падшліфаваць гульню сваіх выхаванцаў. Казімірчык злёгку захваляваўся — было зразумела, што не зможа забраць сяброўку ад фатографа ва ўмоўлены час. Але ўзрасці гэтаму хваляванню не было калі. Пачалася размінка. Баскетбалісты камбінавалі розныя віды бегу — бег з захлістам, скрыжаваны бег. Рабілі паскарэнні. Потым былі практыкаванні на расцяжку. Каманда сядала на падлозе ў кола, выцягваючы пэўныя групы цягліц. Хто рукі цягнуў, хто ногі. Потым мяняліся. Рабілі гэта вельмі зладжана.

Пасля практыкаваліся ў вядзенні мяча правай і левай рукамі, вялі па два мячы, пераводзілі пад нагой, за спінай. Адпрацоўвалі кідкі, у тым ліку штрафныя і трохачковыя. Арцём па трохачковых кідках выявіўся найбольш удалым, заслужана атрымаўшы мянушку Снайпер. Добрыя вынікі цешылі хлопцава самалюбства. Настрой добра прыўзняўся. Працаваць у пары, робячы так званыя «абгульванні», было ўжо значна прасцей. Разам з самым падрыхтаваным таварышам па камандзе — капітанам — Казімірчык рухаўся ад аднаго краю залы да супрацьлеглага кальца. Пазней каманда падзялілася на тройкі, якія зноў жа адпрацоўвалі перадачы, але па значна больш складанай схеме. Гэта вымагала гранічнай уважлівасці. Думаць пра нешта яшчэ, апроч трэніроўкі, папросту не выпадала. Хаця цень нядаўніх думак усё яшчэ трымцеў у галаве. Калі ж пачалося шліфаванне гульнявых стратэгій і камбінацый, за якім пайшла ўласна гульня на два кальцы, ад таго ценю і найменшага знаку не засталося.

Трэніроўка атрымалася добрай і насычанай. Трэнер падзякаваў хлапцам, і тыя пацягнуліся ў распранальню. Арцём імгненна згадаў пра сваё спазненне і вырашыў патэлефанаваць Свеце, думаючы, што на яго мабільніку будуць прапушчаныя званкі ад яе. Прапушчаных званкоў не было. Хлопец таропка выбраў нумар Даброўскай у спісе нядаўніх тэлефанаванняў і пачуў са слухаўкі толькі тое, што абанент недасяжны. Такі паварот яго крыху ўзрушыў. Ён паспешліва прыняў душ, пераапрануўся, яшчэ пару разоў бясплённа паспрабаваў дазваніцца да каханай і подбегам накіраваўся на вуліцу. Шпаркай хадой дайшоў да прыпынку і ўскочыў у аўтобус — каб даехаць да прыватнага сектара, дзе жыў Нікас Сулімаў. Аўтобус ехаў надзвычай павольна, дый яшчэ спыняўся каля кожнага светлафора, патрапіўшы у «чырвоную хвалю». Казімірчык злаваўся і ўшчуваў сябе за тое, што не паехаў маршруткай. Зайшоў з тэлефона ў «кантакт», каб зірнуць, калі там апошні раз была Света. На яе старонцы было пазначана: «Была тут сёння а 14:00», а побач красавалася маленькая выява тэлефоннай слухаўкі. «Значыць, заходзіла якраз пасля факультатыву», — разважыў баскетбаліст, нават не звярнуўшы асаблівай увагі на тое, што з’явілася новае пасланне ад яго колішняй дзяўчыны: маўляў, сумуе па ім. Адно толькі чмыхнуў і выйшаў з інтэрнэту.

Дом фатографа знайшоўся без цяжкасцяў. Гэта быў тыповы катэдж на два паверхі, крыты чырвонай дахоўкай. Яго агароджваў высокі плот з белае цэглы. Арцём ні секунды не вагаўся і націснуў на кнопку дамафона адразу ж, як апынуўся каля брамкі. Яму без маруджання, нічога не спытаўшы, адчынілі дзверы. Хлопец ступіў на двор. Сулімаў сустрэў яго здзіўленай усмешкай і прамовіў:

— О, ды я цябе ведаю! Ты сябар Святланы. Бачыў цябе ў «кантакце». Заходзь, не саромейся. Жадаеш сфатаграфавацца?

— Не. Дзякуй. Я хачу забраць Свету і паехаць дадому, — адказаў Казімірчык, міжволі азіраючы падворак. У вочы тут жа кінулася фотакамера на штатыве і пры-

стасаванні для асвятлення. Трохі воддаль у плеценым крэсле сядзела дзяўчына. Казімірчык быў перакананы, што гэта яго сяброўка. Але не мог зразумець, чаму яна ніяк не адрэагавала на яго з'яўленне. Перш, чым Нікас, які расплыўся ў незразумелай баскетбалісту ўсмешцы, паспеў адкрыць рот, Арцём рушыў да дзяўчыны.

— Я разумею, што ў цябе фотасесія, — гаварыў ён, ідучы. — Але ж навошта мабільнік адключаць? Не паверыш, але я за цябе хваляваўся.

— Што? — здзіўлена перапытала тая і засмяялася. — Я не твая сяброўка. Ты пераблытаў.

Яе твар зблізу аказаўся значна менш падобным, чым за секунды перад тым.

— Упс. Памылачка выйшла. Прабачце, — збянтэжыўся Арцём, агаломшаны падабенствам мадэлькі да сваёй каханай.

— Нічога страшнага, — весела выгукнула тая.

Гэтая блытаніна яе яўна пацешыла.

— Святлана была тут, але гадзіны паўтары таму з'ехала, — таксама пасміхаючыся, патлумачыў гаспадар. — Калі хочаш, я магу табе паказаць на камеры здымкі з ёю. Там і час пазначаны.

— Ну, давайце, — усё яшчэ збянтэжана прамармытаў хлопец.

Фатограф наблізіўся да камеры, настроіў яе на патрэбны рэжым і выбраў здымкі.

— Вось глядзі, — звярнуўся ён да госця. — Гэта першы здымак з яе сённяшняй фотасесіі. І вось бачыш час? 15:03. А гэта… — ён трохі пагартаў захаваныя на карце памяці фатаграфіі. — Гэта апошні здымак. І час. 16:20. А сышла яна адсюль без малага а сямнаццатай гадзіне.

Казімірчык яшчэ раз паглядзеў на здымкі ды на час і не ўстрымаўся ад пытання:

— А што гэта за сукенка на ёй? Яна ж да вас у іншай вопратцы паехала.

— Ой, гэта вельмі проста. У мяне тут ёсць касцюмерка. Кожная мадэль пры жаданні можа выбраць сабе той строй, які ўпадабае. Твая дзяўчына ўпадабала якраз гэтую сукенку, — дадаў яснасці Нікас і спачувальна пацікавіўся: — Святлана не адказвае на твае званкі?

Арцёму не хацелася жаліцца фактычна незнаёмаму чалавеку. Таму ён адказаў вельмі коратка:

— Тыпу таго.

Сказаў і зазбіраўся сыходзіць.

— А яна, дарэчы, перад развітаннем камусь звaніла, — нечакана паведаміў Сулімаў.

— Каму? — не прамінуў удакладніць хлопец.

— Я не ведаю, — развёў рукамі фатограф. — Але чуў, як яна называла нейкае іспанскае ці італьянскае імя або прозвішча. І абяцала некуды прыехаць, каб управіцца за гадзіну. Ну, так я гэта запомніў.

Казімірчык аж скалануўся ад пачутага.

— Ці не Алівейра? — спытаў ён, узгадаўшы «нікнэйм» настаўніка гісторыі.

— Напэўна. Дакладна я не згадаю, — адказаў Нікас, прабачальна гледзячы на яшчэ больш збянтэжанага юнака.

Арцём паспешліва развітаўся і пакінуў падворак. Яго калаціла ад злосці і неўразумення. У галаве не ўкладвалася тое, што Даброўская магла прызначыць нейкую дадатковую сустрэчу свайму настаўніку. Але ж з таго, што расказаў фатограф, акурат гэта і вынікала. Баскетбаліст ускочыў у маршрутку, якая ехала ў цэнтр. Па дарозе ён яшчэ раз паспрабаваў патэлефанаваць сяброўцы. Гэтым разам не толькі на

мабільны, але і на хатні тэлефон. Безвынікова. Едучы ў мікрааўтобусе, кіроўца якога на ўсю гучнасць уключыў песню «Уладзімірскі цэнтрал», хлопец думаў-разважаў, як знайсці Віктара Андрэевіча. Нічога лепшага за тое, каб завітаць у школу, ён не прыдумаў. Так, быў вечар суботы, і верагоднасць таго, што настаўнік затрымаўся на працы, выглядала дужа мізэрнай. Дый калі той сапраўды меў вечаровую сустрэчу са Светай, то шукаць яго менавіта ў школе магло быць цалкам бессэнсоўным заняткам. Але іншай зачэпкі ў хлопца не было.

Казімірчык узбег на школьны ганак і шмыгнуў у вестыбюль. З дзясятак школьнікаў тоўпілася вакол тэніснага стала, уважліва сочачы за гульнёй.

— Малады чалавек, вы куды? — спыталася ў Арцёма жанчына з вахты. — У спартыўную залу ці на харэаграфію?

— Мне б настаўніка гісторыі пабачыць, Віктара Андрэевіча, — не стаў таіць ён.

— Дык Знайдзёнаў ужо сышоў. Спазніліся вы, малады чалавек, — паведаміла тая.

«Дзяўчына прыйшла, і ён паляцеў», — пачуўся за спінай перашэпт малых, які суправаджаўся хіхіканнем. Баскетбаліст рэзка павярнуўся да іх і пацікавіўся, што за дзяўчына завітала да гісторыка. Малыя адно пацінулі плячыма і сказалі, што не ведаюць, працягваючы пры гэтым усміхацца. Іх кароткі дыялог заспеў яшчэ адзін школьнік, які толькі-толькі паспеў зайсці ў вестыбюль.

— Гэта вы пра гісторыка «распрагаеце»? — бойка ўдакладніў ён і, атрымаўшы дадатны адказ, стаў з імпэтам распавядаць: — Я яго толькі што бачыў у скверыку. Ён там прагульваецца. Але не адзін. З нейкай дзяўчынай. Ходзяць там такія ўсмешлівыя, адно аднаму нешта расказваюць.

— Хопіць ужо настаўнікам косткі перамываць! — не вытрывала жанчына з вахты. — Якая вам справа, з кім ён там ходзіць!

Арцём падняў абедзве рукі на ўзроўні шыі далонямі вонкі, дэманструючы тым самым міралюбівы жэст заспакаення. Між тым унутры ў яго ўсё кіпела і вiравала. Каму-каму, а яму вельмі хацелася ведаць, з кім насамрэч шпацыруе тутэйшы настаўнік гісторыі.

Віктара Андрэевіча ён ведаў толькі па фатаграфіях у сацыяльнай сетцы. Але спадзяваўся, што здолее пазнаць, не зважаючы на лёгкія прыцемкі. У скверы было даволі шмат людзей, і многія з іх прагульваліся парамі. Казімірчык кідаў позіркі то на адну пару, то на другую, то на трэцюю. Нікога, хто б нагадваў Свету ці яе настаўніка, ён не знайшоў. Трушком абег увесь сквер, але адшукаць іх так і не здолеў. «Няўжо паспелі сысці? Ці мо ў якую кавярню завіталі?» — пра сябе разважаў ён. Бліжэйшая кавярня стаяла пасярод скверыка. Баскетбаліст стрымгалоў рушыў да яе і літаральна ўскочыў у дзверы. Маленечкая зала была цалкам запоўненая наведвальнікамі. І перш, чым адміністратар падышла да ўзрушанага хлопца, той паспеў разгледзець усіх і выбегчы на двор, бо патрэбных асоб не выявіў. Наступнай яго мэтай стаў суседні рэстаран. Метрдатэль сустрэла яго амаль на самым парозе і паведаміла, што вольных месцаў няма.

— Але, калі вы пачакаеце, то магчыма… — пачала яна, ды Арцём яе перабіў.

— Тут павінны быць мае сябры, — з натужнай усмешкай прамовіў ён.

Метрдатэль з разуменнем кіўнула галавой і прапусціла наведвальніка ў залу.

Пахла піцай і іншымі прысмакамі. Хлопец усвядоміў, што паспеў выгаладацца, і міжволі каўтаў сліну. Ён хадзіў між столікамі і кідаў асцярожныя позіркі на тых, хто сядзеў за імі і адпачываў. Асцярожныя, бо можна было натрапіць на такіх наведвальнікаў, якія падобнай цікавасці не зразумелі б. Лішніх непаразуменняў Казімірчык не хацеў. Дайшоўшы да канца залы, нібы да кальца на баскетбольнай пляцоўцы, ён

нарэшце ўбачыў знаёмы мужчынскі твар. Віктар Андрэевіч задаволена паглынаў востры італьянскі пірог, усміхаючыся сваёй спадарожніцы. Яна сядзела спінай да астатняй часткі залы, і яе твару баскетбаліст разгледзець не мог. Зрэшты, яму гэта і не было патрэбна. І прычоска, блузка, якія былі добра бачныя яму, казалі самі за сябе. Света! Сэрца забілася ў шалёным тэмпе. Не было сэнсу марудзіць. Арцём наблізіўся да іх століка і гучна вымавіў:

— Буркуеце, галубочкі?

4

Настаўнік недаўменна зірнуў на хлопца, хутка пазнаўшы, хто стаіць перад ім.

— Што за клопат, Арцёме? — адказаў ён пытаннем, стараючыся прамаўляць як мага больш нейтральным тонам.

Дзяўчына, якая сядзела з гісторыкам, азірнулася. Хлопец, які толькі-толькі раскрыў рот, каб выдаць пэўнага зместу тыраду, асекся і замоўк. За столікам з Віктарам Андрэевічам сядзела не Света. Яна ні кропелькі не была на яе падобная, дый выглядала старэйшай гадоў на восем.

— Прабачце, — выціснуў ён з сябе і зусім роспачна дадаў: — Мая Света знікла.

— Што значыць знікла? — у момант пазмрачнеўшы, спытаў настаўнік і падсунуў баскетбалісту зэдлік, каб той не размаўляў стоячы.

Казімірчык, наколькі мог, грунтоўна расказаў пра ўсё, што адбылося за апошнія суткі — ад перамогі Даброўскай да яе фотасесіі ў Сулімава.

— І ты падумаў, што яна пасля фотасесіі пайшла на сустрэчу са мной? — здзівіўся Віктар Андрэевіч і тут жа звярнуўся да сваёй спадарожніцы: — Бачыце, Аксаначка, якое ўражанне яшчэ можа скласці Знайдзёнаў у юнацкім асяроддзі.

Спадарожніца гісторыка ўсміхнулася і выказала меркаванне, што Арцём проста лішне перахваляваўся і прыдумаў здарэнне, якога, магчыма, і не было. Хлопца гэта абурыла, але ён абачліва прамаўчаў.

— Ты не крыўдуй, — папрасіў Віктар Андрэевіч. — Тут трэба разабрацца. А вось гэтая прыўкрасная дзяўчына, якую завуць Аксана Мількавец, умее разбірацца ў заблытаных справах.

— У міліцыі ці пракуратуры працуеце? — выказаў здагадку хлопец і, прыняўшы яе за слушную, адцяў: — Я хачу знайсці Свету без міліцыі. Бо калі яе тата дазнаецца, што я не змог у яго адсутнасць усцерагчы дачку, то мне будзе гамон.

— Будзем спадзявацца, што ў міліцыю звяртацца не прыйдзецца, — прамовіў настаўнік. — А Аксана насамрэч мая каляжанка. Заблытаная справа, якую яна разгадала, адбылася гадоў сто таму ў нашым горадзе. Яна гэтаму сваю дыпломную работу прысвяціла.

Дзяўчына зноў усміхнулася, з какетлівай сарамяжнасцю махнула рукой і з удаваным скепсісам прамовіла:

— Ой, знайшлі ўжо з мяне дэтэктыва. Звычайная дыпломная праца.

— Не зусім звычайная. У аднаго гаспадара ў пачатку XX стагоддзя раптоўна прапала сто рублёў. Шукалі тады ўсе, хто толькі мог, але так і не знайшлі. А Аксана на аснове гэтага здарэння гісторыю цэлага гарадскога раёна таго часу раскапала! — захапленню настаўніка не было межаў.

Казімірчык не вельмі хацеў усё гэта слухаць.

— Я сюды не байкі стогадовай даўніны вывучаць прыйшоў, — трошкі завёўся ён.

Пара гісторыкаў пастаралася яго суцішыць.

— Ты дарма злуеш, хлопча, — звярнуўся да яго Знайдзёнаў. — Калі Аксана, расклаўшы факты па палічках, здолела раскрыць злачынства дарэвалюцыйных часоў, то з тваім гэтым здарэннем разбярэцца тым больш.

— А адкуль вы ведаеце, што ваша каляжанка разблытала ўсё правільна? Лагічная пабудова можа выглядаць бездакорна, але на практыцы пры гэтым не спрацоўваць, — нечакана выдаў Арцём. — Вось мы сваёй баскетбольнай камандай выбудоўваем пэўную стратэгію гульні на аснове таго, што мы ведаем пра нашых праціўнікаў. У думках і на словах усё атрымліваецца цудоўна, проста цукерачка. Але прыходзіць гульня, і стратэгія рассыпаецца, быццам картачны домік, а мы прайграем з дзікім лікам.

— Бывае і так, — уражана выслухаўшы развагі юнака, згадзілася Мількавец. — Але з маім дыпломным праектам ёсць пэўная закавыка. Усе высновы па тым крадзяжы цалкам пацвердзіліся пазней. Тут драўляны дом тых часоў знеслі, і рабочыя знайшлі старыя паперы. А між іншага і дзённік аднаго з гараджан пачатку XX стагоддзя, якога я і вылічыла. Дзённікавыя запісы ўсё пацвердзілі. Гэта называецца гісторыя паўсядзённасці. Я працягваю займацца ёй ужо ў аспірантуры. Іншым разам даводзіцца разгадваць і іншыя загадкі таго часу. Думаю, што разам мы зможам разгадаць, што ж здарылася са Святланай. Так што, знойдзем мы тваю сяброўку.

Яна хацела сказаць «жывой ці мёртвай», але ўчасна спахапілася і ўстрымалася ад прафесійнага цынізму гісторыка. Віктар Міхайлавіч заўважыў, што іх суразмоўца змагаецца са спакусай не глядзець на ежу. Нічога яму не кажучы, настаўнік паклікаў афіцыянтку і замовіў тое, што можна было б хутка прынесці. Хлопец пачаў быў пратэставаць, але яго пераканалі, што частавацца, калі запрашаюць, не грэх. Неўзабаве перад ім стаяла піяла грыбнога супу з локшынай, салата з гародніны, апетытны кавалак мяса з запечанай бульбай.

— Італьянская кухня такая італьянская, — жартаўліва адзначыла аспірантка.

— Ты, хлопча, налягай на ежу, а мы тут раскладзем карты, — адправіў неабходны імпульс Знайдзёнаў.

Юнак прыняўся за суп. Мількавец дастала вялікі нататнік, адгарнула чыстую старонку, каб сцісла фіксаваць версіі, якія яна збіралася вылучыць. Згодна з першай версіяй Даброўская не знікла, а проста апынулася за межамі дасяжнасці з прычыны таго, што не можа пазваніць, бо батарэя мабільніка разрадзілася. Баскетбаліст адмоўна паматляў галавой і паведаміў, што яна ў такім разе змагла б знайсці спосаб звязацца.

— Папрасіла б у каго-небудзь тэлефон. Такое ўжо было некалькі разоў, — згадаў Казімірчык.

— Тады версія нумар два. Ад мяне асабіста, — уклініўся настаўнік. — Ты, хлопча, наўмысна пажартаваў наконт знікнення сваёй сяброўкі, каб падысці да нас і пабалакаць з такой красуняй, як адна мая знаёмая аспірантка.

Аксана засмяялася і скрозь смех заявіла, што версія адразу ж здымаецца як некампетэнтная і антынавуковая. Гэты пасаж трошкі развесяліў Арцёма, і ён ледзьве не назваў настаўніка пікап-майстрам 80-га ўзроўню. Аспірантка выдала сустрэчную версію, звяртаючыся да Казімірчыка:

— Дапусцім, што хлусіць наш дарагі Віктар Андрэевіч. Дапусцім, што гэта ён на самой справе выкраў і схаваў тваю сяброўку. Але ў які час ён гэта мог зрабіць? Яўна не ў час факультатыву, бо твая любімая плыўчыха пасля яго засвяцілася ў фатографа. А пасля фотасесіі ў школе яе не бачылі. А па-за школай сустрэцца з нашым панам настаўнікам яна таксама ўвечары не магла, бо са школьнага вестыбюля і да гэтага рэстаранчыка яго суправаджала я.

— Пры ўмове, што вы не хлусіце, каб пакрыць хлусню пана настаўніка, — урэзаў штучку хлопец на той жа хвалі развагаў.

— О, ты з-пад каня-скакуна падковы адрываеш, — з посмешкай адрэагавала Мількавец. — Так, магчыма хлушу і я. Але прамежак часу між школьным ганкам, скверыкам і рэстаранчыкам настолькі мізэрны, што нават, калі бы мы і хацелі некуды запраторыць тваю любінятку, то наўрад ці б змаглі.

Арцём моўчкі згадзіўся і спытаў, ці можа хлусіць фатограф.

— А ў чым менавіта ён мог схлусіць? — задумалася аспірантка. — Святлана ў яго была. Ты бачыў здымкі. Спецыяльна на Алівейра ён не ківаў, ты сам пра гэта дадумаў. Ці мо падазраеш, што Святлана з нейкай прычыны магла застацца ў яго?

Юнак пацiснуў плячыма і сказаў:

— Гэты Нікас трошкі дзіўны. Манерны такі. Ці што… Але мне здалося, што ён быў шчыры ў сваіх словах.

— Тады наступная версія… — Аксана на імгненне замялася, але ўсё ж агучыла: — Няшчаснае здарэнне па дарозе ад фатографа.

Хлопец цяжка ўздыхнуў. Яму складана было нават думаць пра тое, што яго сяброўка магла трапіць пад колы аўтамабіля ці зваліцца ў якую-небудзь траншэю. Апошніх ён, дарэчы, шмат бачыў, пакуль ішоў да катэджа фатографа і назад. Настаўнік, які пэўны час адно назіраў за гаворкай, выцяг з сумкі планшэт і зайшоў на гарадскі сайт, паглядзеў, якія здарэнні адбыліся ў горадзе за апошнія гадзіны. Нічога, што магло хоць неяк нагадваць пра Даброўскую, там не было. Настаўнік агучыў гэта і дадаў:

— Але, на жаль, гэта пакуль не дае стопрацэнтнай гарантыі.

Казімірчык пацікавіўся ў аспіранткі, ці ёсць у яе яшчэ якая-небудзь версія.

— Так, — сказала яна. — Ты казаў, што яе бацькі з'ехалі на пару дзён у Літву, у тым ліку і па бізнес-справах яе таты. А што, калі знікненне Светы звязана з татавым бізнесам?

— Ой, блін… — ніякавата прашаптаў хлопец. — Я нават не падумаў пра гэта. Яно ж можа быць самым рэальным…

— У дадзеным выпадку не можа, — заўважыў настаўнік, гледзячы на гадзіннік. — Часу мінула ладна ўжо. Калі б выкралі і схавалі, то ўжо б не прамінулі звязацца з яе бацькам і заявіць пра сябе. Не сталі б чакаць, пакуль ён у Беларусь вернецца. А калі б яны звязаліся з ім, то бацька Светы пазваніў бы табе ўжо.

У гэты самы момант у юнака зайграў мабільнік. Ён зірнуў на экран і жахнуўся: тэлефанаваў акурат тата каханай. Паведаміў пра гэта суразмоўцам і націснуў «прыняць выклік».

— Алё, Цёма, як вы там? Нешта не магу да Свеціка дазваніцца, — гучала з дынаміка тэлефона.

— Усё добра, — сабраў волю ў кулак Арцём. — Проста батарэя ў яе мабільніку здохла.

— Ясна. Перадай ёй трубку.

Баскетбаліст зрабіў вялікія вочы, мімікай просячы дапамогі. Настаўнік склаў пальцамі трохкутнік, намякаючы на знак, які звычайна малююць на дзвярах жаночай прыбіральні.

— А яна якраз у дамскі пакой выйшла, — учапіўся хлопец за падказку.

— Дык вы у кабаку якім заселі?

— Так. У піцэрыі.

— Гуляйце, але не загульвайцеся. Перадавай Свеціку прывітанні ад мяне і ад мамы.

— Добра. Прыемнага адпачынку.

Казімірчык уздыхнуў з такой палёгкай, нібыта толькі што скончыў разгружаць шматтонныя кантэйнеры. Палёгку спараджалі дзве думкі: першая — адкрут яго галавы пераносіцца на няпэўны час, другая — Свету не выкралі.

Час ішоў, а плёну з вылучаных версій не было анізвання. Мількавец пацікавілася, ці не забыў хлопец чаго расказаць? Той адразу ж хлопнуў сабе далонню па лбе, згадаўшы Насцю Навіцкую і яе жаданне сустрэцца са Светай удзень.

— Праўда, я не ведаю, ці адбылася іх сустрэча, а калі адбылася, то ў які час, — прызнаўся ён.

— Света прыйшла да мяне ў гуморы, — адразу ж зазначыў Віктар Андрэевіч. — Усміхалася. Хвалілася перамогай. Пра Навіцкую зусім нічога не казала.

— Я перакананы ў адным: калі яны сустрэліся, то між імі абавязкова разгарэлася б сварка, — запэўніў юнак, агучыўшы сваё ранейшае меркаванне.

— Ой! — абурана усклікнуў настаўнік. — Ну, колькі на белым свеце дзевак і колькі між імі сварак! Падумаеш, Навіцкая пакрыўдзілася за паражэнне ў спаборніцтвах. Якія могуць быць крыўды? Гэта ж спорт, дзетка! Цябе абагналі на сотую долі секунды? Значыць, лепш трэніравацца трэба, каб абганялі не цябе, а ты сама абганяла ўсіх. Не думаю, што гэтая Насця замешаная ў цёмнай справе. Які сэнс у гэтым? Перамогу ж не вернеш ужо!

— О, сэнс тут якраз можа быць у празе помсты, — не пагадзілася з ім аспірантка. — Згадайце гучную справу «прынцэсы тусоўкі». Што «прынцэса» зрабіла са сваёй канкурэнткай? Кінула ў падмосце, дзе тая памерла ад пераахаладжэння.

— Ну, дык то калі было! У часы «перабудовы». Свет жа на месцы не стаіць, — не здаваўся Знайдзёнаў.

— Не стаіць. У нечым ён нават горшым стаў, — пракаментавала яго словы Мількавец, але каб не саскокваць канчаткова на іншую тэму, удакладніла ў юнака: — Які у Насці мог быць матыў?

— Яна хацела перамагчы і ехаць у Нямеччыну. Нібыта там мог быць добры кантракт, — адказаў той.

— А калі Света павінна была пацвердзіць свой ад’езд? — не спынялася Аксана.

— Перамогай пацвердзіла, — ухмыльнуўся Арцём. — Праўда, заўтра ўвечары ў палацы водных відаў спорту будуць узнагароджваць плыўцоў нашага горада. Дык вось перад ёй Света павінна падпісаць сія-тыя паперы.

— А калі яна не з’явіцца?

— Тады яе права на паездку анулююць. Я не ведаю, адкуль у іх там такія жорсткія правілы. Але нібыта ўсё менавіта так.

— Ну, вось вам і чыстай вады матыў, — рэзюмавала Мількавец.

— Ды няўжо юная амбітная спартсменка, якая хоча збудаваць сабе добрую кар’еру, сапраўды стане апускацца да такога! — Віктар Андрэевіч усё адно заставаўся пры ўласным поглядзе.

— Да якога такога? Я ж не кажу, што Насця, цьху-цьху, забіла Свету. Яна магла яе проста нейтралізаваць і трымаць недзе, каб тая не здолела заўтра трапіць на падпісанне дакументаў…

— Стойце, — Казімірчыка прабіла на новую здагадку. — Каб нейтралізаваць, неабавязкова біць па галаве ці накідаць наручнікі на запясці. Можна добра прабавіць час побач з чалавекам, а назаўтра гэтаму чалавеку будзе так кепска, што аж свет перастане быць мілым! Не кажучы ўжо пра нейкі там палац водных відаў спорту.

— Напаіць? Ці падсыпаць слабіцельнае або яшчэ нешта ў пітво? — падхапіла яго развагі аспірантка.

— Так, — пацвердзіў ён правільны напрамак разваг Аксаны: — Дык вось, а што калі ў размове па тэлефоне, якую міжволі пачуў Нікас, Света згадвала не Алівейра, а нейкую збольшага падобную назву рэстарана ці рэст-клуба?

— І ты думаеш, што гламурны фатограф не ведае назваў тутэйшых спажыўных месцаў? — усумніўся Знайдзёнаў.

— Калі гэткая ўстанова толькі-толькі адкрылася, то можа і не ведаць, — падтрымала хлопца аспірантка. — Напрыклад, я падобных назваў не чула, але акрамя справаў стогадовай даўніны клубна-рэстаранным жыццём цікаўлюся.

Баскетбаліст зірнуў на яе з непрыхаванай павагай. Настаўнік скарыстаўся пошукавікам і сапраўды — у новым мікрараёне пару тыдняў таму адкрыўся забаўляльны комплекс з назвай «Алівер».

Мікраараён быў зусім не наводшыбе, а даволі блізка ад цэнтра. Аднак дабрацца да яго грамадскім транспартам было трохі складана. Арцём агучыў пытанне: імчаць у забаўляльны комплекс, давяраючы нічым не падмацаваным высновам, ці адразу шукаць Навіцкую як такую? І так, і так можна было памыліцца, дый змарнаваць час. Вырашылі ўсё ж ехаць у «Алівер». «Як-ніяк падобную назву, калі верыць Сулімаву, агучвала Света. А значыць, дзяўчына можа быць якраз там», — падвёў рысу Віктар Андрэевіч. Разлічыўшыся з рэстаранам, тройка рушыла да выхада. Аксана прапанавала скарыстацца яе аўто, куды праз хвіліну ўсе шчасна загрузіліся.

5

У дарозе шукальнікі не спынялі сваіх разважанняў.

Хлопец наракаў, што не ўзяў раней нумар тэлефона Насці.

— У «кантакціку» ёй не напішаш, — скептычна прамовіў ён.

— А калі проста на яе старонку зайсці? — уклінілася Мількавец, не зводзячы вачэй з дарогі. — Можа, там і тэлефон пазначаны ці яшчэ нешта цікавае знойдзецца. Гэта ж сацыяльная сетка, трэба ёй карыстацца не толькі для таго, каб баламутлівыя статусы ставіць. *«Калі табе плююць у спіну, значыць, ты ідзеш наперадзе»*. Зрэшты, іншым разам і па статусе можна пра штосьці даведацца.

Казімірчык выйшаў у сеціва праз мабільнік, а Знайдзёнаў зноў скарыстаўся планшэтам. Хутка знайшлі патрэбную старонку. Насця Навіцкая ўсміхалася з аватаркі, якую паставіла тры тыдні таму. Тэлефонных нумароў на старонцы не знайшлося. Свежых фотаздымкаў з якой-небудзь гулянкі не было. Статус быў зусім нейтральным. Прынамсі, ні на што асаблівае не намякаў: «Не бойся марудзіць, бойся спыніцца». Адзінае, што дакладна можна было сказаць пра яе сённяшні дзень — сацыяльную сетку апошні раз Насця наведала зусім нядаўна. Прыблізна тады, калі Арцём паглынаў грыбны суп з локшынай. Ён перайшоў на старонку каханай. Там нічога не змянілася. Час яе апошняга заходу заставаўся ранейшым.

Настаўнік між тым прыступіў да больш уважлівага вывучэння папярэдніх допісаў і каментароў на «сцяне» Навіцкай. Менш, чым за суткі, яна асабіста змясціла з дзясятак карцінак і песень. Гісторык меркаваў, што гэта мусілі б быць нейкія тужлівыя выявы і меланхалічныя трэкі — як вынік перажывання паразы. Аднак усё было чыста наадварот. Пра саму паразу дзяўчына напісала досыць завуалявана для староннiх людзей, але цалкам празрыста для тых, хто ў курсе:

«Сотая долі секунды — і твае мары разбіваюцца ўшчэнт». Пад гэтым запісам стаяў адзін каментар з сумным смайлікам: «Вось яна і ў цябе забрала мару». Пакінула нейкая дзяўчына. Знайдзёнаў перайшоў на яе старонку. У вочы адразу кінуўся вычварны статус: «Я лялька вуду, плакаць не буду, але ніколі цябе не забуду». Падобнымі цытатамі поўнілася «сцяна». Сярод падпісак былі групы «Я не сцерва — гэта нервы», «Гэта пафас? — Гэта пофіг!», «Скроенае сэрца кінутай дзяўчыны»… У апошнім допісе на «сцяне» была цытата: «Ты проста быў часцінкаю мяне…» і фатаграфія хлопца з баскетбольным мячом. Віктар Андрэевіч не тое, каб не даў веры сваім вачам, але на ўсялякі выпадак адкрыў здымак у арыгінальным памеры. Сумневаў не заставалася — на фатаграфіі быў Казімірчык. У ранейшых допісах таксама былі фоткі і калажы з ім. Мужчына зірнуў на імя і прозвішча гэтай дзівачкі і спытаў у юнака:

— Хто такая Каця Беланосава?

— Мая былая дзяўчына, — у момант пачырванеўшы, прызнаўся той, і насцярожана удакладніў: — А што такое?

— А вось што! Па-беларуску гэта называецца «кляты сорам», — выгукнуў ён, перадаючы планшэт. — Як вам рэўнасць кінутай дзяўчыны ў якасці матыву?

Аксана хутка ўлавіла сэнс чарговага адкрыцця.

— Ды мы з ёй усяго пару месяцаў сустракаліся, калі вучыліся ў дзявятым класе. Столькі часу прайшло, а яна ўсё ў сваіх фантазіях лётае, — паспяшаўся выгаварыцца Арцём, каб толькі ў спадарожнікаў не склалася ўражанне, быццам ён мае з гэтай «лялькай вуду» нешта агульнае.

Знайдзёнаў забраў назад планшэт і хутка праглядзеў больш даўнія допісы на «сцяне». І вось «пост» двухтыднёвай даўніны прымусіў яго нават прысвіснуць. Там красаваў супольны здымак Беланосавай і Навіцкай. Яны стаялі ў абдымку на фоне барнай стойкі і задзірыста ўсміхаліся, працуючы на аб'ектыў. Фота суправаджалася надпісам: «Мммм, «Алівер»! Было класна. Трэба паўтарыць!».

— Гэта Насця з ёй? — без патрэбы ўдакладніў настаўнік.

Юнака аж двойчы перасмыкнула — спачатку ад нечаканага пытання, а потым ад убачанага на экране. Адказваць было лішнім. Гісторык зрабіўся сур'ёзным.

— Я вельмі хачу спадзявацца, — з каменным тварам мовіў ён, — што зараз мы ўбачым іх утраіх. І Насцю, і Кацю, і тваю Свету. Хочацца верыць, што яны змаглі паразумецца і проста загулялі.

Аксана рэзка націснула на тормаз, каб не стукнуцца з грузавічком, які раптоўна выехаў з-пад біг-борда.

— Ці ж ён зусім аслеп? Ці проста правілаў дарожнага руху не ведае? — абуралася яна, ледзь не вымавіўшы тых словаў, якія не пасуюць мілай аспірантцы.

— А што яму? Яму абы хутчэй. На адзін шчыт новы біг-борд з напарнікам павесілі, цяпер да іншага спяшаюцца. Ваўка ногі кормяць, — развàжыў хлопец, якога добра страсянула.

— Каб толькі гэты воўк не накарміў багіню смерці чалавечымі ахвярамі, — незадаволена выдала Аксана.

— А што там на біг-бордзе было? — нібыта нічога і не адбылося, спытаўся настаўнік.

— Напэўна, нейкая сацыяльная рэклама, — выказаў меркаванне Арцём. — Я не звярнуў увагі. Там, здаецца, здымак з дзяўчынай і нейкі надпіс. Нешта тыпу: «Мая новая фраза да цябе будзе…». А што далей, не ўспомню.

Мількавец, усё яшчэ злавалася і падтрымліваць гутарку на завязаную тэму не стала.

6

Забаўляльны комплекс атакавала мноства наведвальнікаў. Усё-ткі ж быў суботні вечар, які пачынаў хіліцца да ночы. У «Аліверы» меўся з дзясятак аўтаномных бараў, рэстаранаў і адна вялікая дыскатэчная зала. Пра гэтую акалічнасць тройца шукальнікаў неяк і не падумала. Адныя спяшаліся ў сушы-бар, другія на дыскатэку ў стылі зомбі-апакаліпсісу, трэціх цікавілі іншыя забаўкі, кшталту гоў-гоў танцаў. Стоячы на ганку комплексу, Аксана, Арцём і Віктар Андрэевіч акурат назіралі плынь вясёлых наведвальнікаў апранутых пад зомбі. Коратка параіўшыся, шукальнікі рушылі да дзвярэй. Збіраліся абходзіць усе ўстановы комплексу ў спадзеве, што дзе-небудзь пашанцуе знайсці Навіцкую і Беланосаву. «Абы яны толькі ў зомбі не былі апранутыя», — падумаў баскетбаліст. На шчасце, ісці далёка не давялося. З дзяўчатамі сутыкнуліся ў дзвярах. Тыя адразу ж пазналі Казімірчыка. Здзівіліся і яму, і ягонай кампаніі. Каця нават войкнула. Давялося ім хутка задаваць пытанні. Яны выслухалі і пагадзіліся адысці ўбок, каб паразмаўляць без сведкаў.

Хлопец адразу ж запытаўся ў Насці пра яе сустрэчу са Светай. Тая ахвотна і даволі роўна патлумачыла, што яны бачыліся пасля дзвюх гадзін дня ў прысадах каля школы. Сказала, што спрабавала ўгаварыць Даброўскую адмовіцца ад паездкі ў Нямеччыну.

— Я рэальна заслужыла гэтую паездку, — запэўнівала Насця, агучваючы сваю крыўду. — Я шмат трэніравалася. Прыклала столькі намаганняў, каб дасягнуць высокіх вынікаў. Па сутнасці, я ўвесь год працавала на перамогу ва ўчарашніх спаборніцтвах. А Свеце заўжды ўсё давалася лягчэй. Яна часта перамагала, нібыта гуляючы. Дый увогуле ёй заўсёды больш шанцуе.

— І калі яна адмовілася, ты вырашыла зрабіць ёй нешта кепскае? — не стаў хаваць сваіх падазрэнняў юнак. — Разам з Кацяй вы некуды яе завабілі і там…

— Гэта не смешна. Перастань так жартаваць, — папрасіла плыўчыха, састроіўшы вельмі сур'ёзную міну.

— А што я павінен казаць! Мая дзяўчына знікла без звестак! Ніхто нічога не ведае! Ніхто ні ў чым не вінаваты! А Светы, як не было, так і няма! — усхадзіўся Арцём, ажно Віктару Андрэевічу прыйшлося торгаць яго за рукаў. Яго крык справе нічым дапамагчы не мог, а толькі прыцягваў увагу староннiх людзей. Пара амапаўцаў, якія стаялі каля іншага краю будынка, ужо скіравалі свае позіркі на іх. Але юнак сцішыўся, і тыя адразу згубілі інтарэс.

— Мы паразмаўлялі са Светай. Але яна так і не сказала ні «так», ні «не», — працягвала Навіцкая. — Яна сказала, што параіцца з табой. Маўляў, паездка выдатная, але ехаць туды проста дзеля самой паездкі сэнсу мала, бо заключаць там кантракты яна вялікага жадання не мае. А ўсё чаму? А ўсё таму, што не хоча губляць цябе. Яна абяцала пазваніць мне сёння ўвечары. Але не пазваніла. Калі шчыра, пачуўшы ад яе ўсё гэта, я расчулілася. Я не чакала ад яе такога разумення і такіх адэкватных паводзін. Нават расказала ёй, што мы з Кацяй завіснем сёння ў «Аліверы».

Здзіўленню Казімірчыка не было межаў. Яго спадарожнікі таксама здзівіліся нямала. Хлопец, быццам не верачы, што паміж Светай і Насцяй не было сваркі, а між Насцяй і Кацяй змовы, звярнуўся да апошняй:

— А ты чаго мне сёння пісала?

— Па ціхай журбе, — выціснула яна з сябе, хаваючы вочы, чым нагадала прысаромленую шкадлівую котку.

Дзяўчаты кляліся і божкаліся, што ўвечары Даброўскай не бачылі, а пагатоў шкоды ёй ніякай не чынілі. Беланосава нават заплакала. Доказаў іх недатычнасці да

знікнення Даброўскай не было аніякіх, але шукальнікі фармальна выкраслілі абедзвюх са спісу падазраваных. Ім наказалі на прамілы бог нідзе нічога пра знікненне Светы не балбатаць, а то, як наўмысна падкрэсліў Знайдзёнаў, *«шчэ невядома, як усё ета дзела павернецца»*.

7

Цяпер засталіся толькі два варыянты. Або шукаць навіны пра няшчасныя здарэнні, або звярнуцца да асобы апошняга вядомага сведкі. Сайт здарэнняў утрымліваў новыя зводкі, але Святлана ў ніводнай з іх не фігуравала. Сталі наноў абмяркоўваць фатографа. Атрымлівалася, што ён быў ці не апошнім, хто дакладна бачыў зніклую. Па сутнасці, Сулімаў стаў адпраўным пунктам большасці далейшых лагічных пабудоў і Арцёма, і Аксаны. Прасцей кажучы, усё скокі пачаліся менавіта ад яго аповеду. Паўстала пытанне: а што, калі ён прыдурваўся? Нельга было скідваць з рахункаў версію, што ён прыдумаў, нібыта падслуханае ў Светы прозвішча, каб наўмысна пусціць Арцёма ілжывай каляінай. Гэтым Нікас кідаў цень на настаўніка. Але ці закладваў ён у свой ход двухсэнсоўнасць, ці так атрымалася праз збег абставін — пра гэта ніхто меркаваць не браўся.

Следам ішло наступнае пытанне — ці мае фатограф дачыненне да знікнення Даброўскай. Матываў для выкрадання не праглядалася. Шукальнікі на нейкі час замоўклі ў роздуме. І раптам настаўнік схапіўся за галаву і звярнуўся да баскетбаліста:

— Ты казаў, што пераблытаў яго чарговую мадэльку са Святланай. Яны такія падобныя?

— Здалёк нават вельмі падобныя. Дый зблізку падабенства ёсць, — прызнаўся юнак.

— Ясна. А ты альбомы з мадэлькамі на яго старонцы глядзеў?

— Глядзеў. Я яшчэ Свеце тады сказаў. Там жа ўсе мадэлі аднатыпныя… — сказаў Казімірчык, на імгненне асекся, даўмеўшыся да сутнасці, і потым працягнуў: — Ды яны ж там усе чыста падобныя на Свету!

— Вось! — літаральна выкрыкнуў Віктар Андрэевіч. — Ён фатаграфуе дзяўчын, падобных адна на адну. Гэта ўжо нагадвае не проста захапленне, але пэўную манію. А што калі разам з фатаграфіямі Нікас калекцыянуе і саміх мадэлек?

— Калі ты маеш на ўвазе серыйныя забойствы, — скептычна выдала Аксана, — то гэтага не можа быць: пра гэта б даўно не толькі ведаў увесь горад, але і цэлая краіна стаяла б на вушах. Дый і не было б тады серыі гэтых здымкаў у інтэрнэце.

— Я не пра забойствы, — запярэчыў настаўнік. — Я пра калекцыю яго… гмм, так бы мовіць, *блізкасці* з мадэлькамі. Сфатаграфаваў адну — *зблізіўся*. Сфатаграфаваў другую — *зблізіўся*. Ну, і так далей.

— І ўсё ж для сэксуальна заклапочанага свяціць такія калекцыі-фотасесіі было б занадта небяспечна. Ці мала розных дамарослых дэтэктываў у «кантакце» сядзіць? — трохі падумаўшы, адцеміла Мількавец.

— Але ж з альбомаў нічога такога і не вынікае. Здымкі прыгожыя і строгія. Без фрывольнасцяў, — канстатаваў настаўнік.

— Бо для фрывольнасцяў ён знаходзіць іншы час! — гнеўна гыркнуў хлопец. — Трэба тэрмінова ехаць туды і прыдзірліва пагаманіць з гэтым тыпам. Я збяру сваіх сяброў па баскетболе і па гульні ў «Схватку». Калі спатрэбіцца, то возьмем штурмам гэты чортаў катэдж!

Такая рашучая заява спужала спадарожнікаў.

— Толькі незаконнага пранікнення ў прыватныя ўладанні нам яшчэ не хапала! — абурылася Аксана, шукаючы падтрымкі ў калегі.

— Я люблю прыгоды, але ж быць Андрэем Беларэцкім не жадаю, — настаўнік адхрысціўся ад словаў Арцёма, згадаўшы героя «Дзікага палявання караля Стаха». — Давай мы паедзем да Нікаса, і я адзін паспрабую з ім паразмаўляць.

— А які з гэтага будзе толк? Ён вам пасмяецца ў твар. Ці зноў пад дурня закосіць. Трэба прабірацца ў катэдж, каб адшукаць там Свету. Калі вы не хочаце мне ў гэтым дапамагаць, то я не пакрыўджуся. Вы і так многа для мяне зрабілі.

— Не, Арцёме, мы цябе не кінем, — запэўніў настаўнік. — Можа, да сённяшняга дня ў Сулімава ўсё было гладка. Дзяўчаты пагаджаліся. А вось наша Святлана адмовіла, і ў фатографа перамкнула клемы. Ну, ці не можа такое быць? Яна сказала яму «не», а ён яе за гэта ў пакоі зачыніў. Так што Бог з ёй, з рэпутацыяй. Калі мы выратуем дзяўчыну, то пераможцаў не асудзяць.

— Гэта пафас? — саркастычна ўдакладніла аспірантка.

— Гэта пофіг, — не стрымаўся ён выдаць у адказ, усміхаючыся адно куточкамі вуснаў.

8

Хлопец і дзяўчына, знаёмыя баскетбаліста, сталыя ўдзельнікі «Схваткі», падышлі да падворка катэджа Сулімава. Яны павінны былі нештачка інсцэніраваць і тым самым апынуцца ў катэджы. Потым мусілі б дзейнічаць па абставінах і патэлефанаваць астатнім, калі здабудуць хоць нейкую інфармацыю. Знаёмцы тут былі патрэбныя толькі з-за таго, што Віктара Андрэевіча і Аксану фатограф мог ведаць у твар, дзякуючы здымкам у сацыяльнай сетцы.

Хлопец націснуў кнопку дамафона. Пэўны час на гэта не было ніякай рэакцыі. Праз дарогу пад шатамі дрэва стаялі Казімірчык, Знайдзёнаў, Мількавец, а таксама два сябры Казімірчыка. Усе пільна прыглядаліся да дзвярэй. На выпадак няўдачы яны збіраліся задзейнічаць дадатковы план. Прынамсі, на гэта разлічваў Арцём. Аднак у дамафоне пачуўся зусім не сонны, але яўна незадаволены голас гаспадара. Хлопец прыняўся удаваць заклапочанага маладога мужа, жонка якога вось-вось павінна нарадзіць. Нікас параіў або не жартаваць так, або выклікаць хуткую. Дзяўчына тут жа пачала лямантаваць, ствараючы падабенства крыку. Яе напарнік адначасова з гэтым паспеў крыкнуць у дамафон, што тэлефоны разрадзіліся, а далей ісці проста немагчыма. Фатограф паабяцаў выклікаць хуткую дапамогу, але хлопец зноў жа паспеў уплішчыць фразу: «Але тады мая жонка рызыкуе нарадзіць проста на асфальце». Гаспадар здаўся. Хлопец і «цяжарная» дзяўчына зайшлі ў дзверы, што аўтаматычна адамкнуліся.

Час пасля таго, як пара знікла ў зеўры дзвярэй, імгненна запаволіўся. Калі ж мінула пятнаццаць доўгіх хвілін, а ад «маладой сямейнай пары» не паступіла ніякага сігналу, Казімірчык пачаў дужа нервавацца. Намякаў на тое, што прыспеў час караскацца праз агароджу, імчаць у катэдж і вызваляць не толькі Свету, але і сяброў па «Схватцы». Настаўнік раіў пакуль не гарачкаваць. «Ды што не гарачкаваць! — усхадзіўся Казімірчык. — Можа, ён іх ужо на рамяні крамсае! А мы тут сядзім». У гэты час азваўся яго мабільнік. Званіў акурат «малады муж»: «Света тут. Здаецца, што ўсё ў парадку. О, божа! Нeee…». Званок перарваўся. Арцём ашалела залыпаў вачыма і паспрабаваў перазваніць. Абанент ужо быў недасяжным. Баскетбаліст узрушыўся да

неймавернасці. Стрымаць яго было ўжо немагчыма. Ні Віктар Андрэевіч, ні Аксана не маглі на яго паўплываць. Юнак настроіўся на рашучы крок. Разам з дружбакамі-баскетбалістамі ён перабег вузкую вуліцу. Яны спыніліся каля цаглянага плота. Сябры спрытна падсадзілі Казімірчыка ўгору. Потым адзін падсадзіў другога. Таму ж, хто застаўся, першыя дапамаглі ўскараскацца. Знайдзёнаў і Мількавец толькі падышлі да плота, як баскетбалісты разам скокнулі ў двор. Як толькі тыя апынуліся на падворку, запаліліся два пражэктары. Яны свяцілі хлопцам у твары. Пачуўся выразны камандны голас, і аднекуль павыбягалі ўзброеныя аўтаматамі людзі ў камуфляжнай форме ды балаклавамі на тварах. Яны змусілі юнакоў пакласці рукі за галаву, развярнулі да сцяны і абшукалі. Яшчэ двое падобных бамбізаў пад рулямі аўтаматаў прывялі на падворак настаўніка і аспірантку. Усіх агаломшаных такой сустрэчай «гасцей», акром «сямейнай пары», пашыхтавалі. У святле пражэктараў з'явіўся Сулімаў. Ён ішоў з развальцай у хадзе, трымаючы келіх з шампанскім.

— Ну, што, рабяткі? — п'яным голасам звярнуўся ён да пашыхтаваных. — Хочаце сказаць, што я не здолеў вас падмануць?

— Мы цябе вылічылі! Табе капцы! Зараз міліцыя прыедзе! — пракрычаў яму на гэта Арцём, спрабуючы блефаваць.

— Не прыедзе. Не хлусі, — катэгарычна не паверыў гаспадар катэджа. — Час на тое, каб падумаць над вашым лёсам, у мяне ёсць. І ведаеце да чаго я зараз больш за ўсё схіляюся? Я схіляюся да банальнага масавага забойства. Можа, не адразу ўсіх. А па чарзе.

— Куды ты дзенеш столькі трупаў, Гітлер местачковы? — з яўным выклікам настаўнік задаў цалкам рэзоннае пытанне.

У спіну яму адразу тыцнулі дулам аўтамата.

— Ты не перажывай, педагог-наватар, — ашчэрыўся падабенствам усмешкі фатограф і прыклаў два пальцы сабе пад нос, імітуючы гітлераўскія вусікі. — Усіх дзенем туды, куды трэба. З той «сямейнай парай» вас сямёра. Траіх мы застрэлім і затрамбуем у багажнік аўтамабіля тваёй мілай спадарожніцы. Астатніх заб'ем бейсбольнымі бітамі і пасадзім у салон усё таго ж аўтамабіля. Разам з пісталетамі, якімі будуць забітыя першыя тры. Адбіткі пальцаў і ўсё такое. Потым мы скінем гэтую прыўкрасную машынку з якога-небудзь моста. Можам і падпаліць загадзя. А там няхай шаноўная міліцыя разбіраецца.

— Чаму сямёра? А дзе Света? — спытаў Арцём.

— Света застанецца са мной, — рэзка адцяў Нікас, але пасля глытку шампанскага і наўмыснай імітацыі роздуму, дадаў: — Карацей, вось што я надумаў. Ты ж яўна хочаш пабыць са сваёй дзяўчынкай яшчэ хоць трохі. Вось гэта я магу табе паабяцаць. Але пры пэўнай умове.

— Якой? — пацікавіўся Казімірчык, чакаючы нейкага кручельства.

— Ты пераможаш мяне ў кідках мяча ў баскетбольнае кальцо, — урачыстым тонам абвясціў Сулімаў.

Баскетбалісты міжволі пераглянуліся. Віктар Андрэевіч зірнуў на Аксану, мімікай даючы зразумець, што прадбачыць нейкую «дзічыну» у тым, што прапаноўваў прамоўца. І сапраўды, доказ гэтаму абазначыўся адразу ж. Арцём паспрабаваў удакладніць, што ды як. На гэта ён атрымаў вельмі жорсткае тлумачэнне:

— Кідаем па тры мячы. Калі ты выйграеш, то пабачышся са Светай. Калі будзе нічыя, ты пабачышся з ёй праз вакно. Калі выйграю я, то цябе прыстрэляць самым першым. Калі ты зараз адмовішся ад гульні, то будзе застрэлены адзін з тваіх сяброў. Калі і пасля гэтага ты не захочаш гуляць, застрэляць другога. Ну, а наступных, калі ты так і не саспееш да гульні, затаўкуць бітамі, як я і абяцаў раней.

Усе, каго трымалі пад дуламі аўтаматаў, паглядзелі на Арцёма. Пастаўлены перад выбарам юнак не ведаў, як сябе паводзіць і што рабіць.

— А іншых умоваў няма? Я не магу распараджацца жыццямі іншых людзей, — урэшце азваўся ён, з нянавісцю гледзячы на Сулімава

— Не трэба сабе лесціць, малы, — нядобра ўсміхнуўся той. — Жыццямі ў кожным разе тут распараджаюся я. Так што…

— Дазвольце мне замест Цёмы пакідаць мячы ў кальцо, — раптоўна выклікаўся адзін з яго сяброў — капітан іх баскетбольнай каманды.

— О! Якое пахвальнае імкненне! — выгукнуў фатограф. — Я магу гэта дазволіць. Але тады ў разе тваёй перамогі ці нічыі на Свету будзеш глядзець ты сам, а не твой дружбак Цёма.

Пашыхтаваныя былі ў ступары. Усё здавалася нерэальным, быццам гэта сон ці трызненне. Нікому не хацелася верыць, што праз нейкі час яны могуць стаць ахвярамі дзікунскай бойні. Паплечнік капітана каманды не вытрымаў. Ён рэзка павярнуўся, адной рукой ухапіўся за аўтамат, а другой паспрабаваў ударыць свайго «канваіра». Той, аднак, спрытна, адскочыў да плота, ператоргнуў замок аўтамата і рашуча скіраваў яго на парушальніка спакою.

— Вось такога рабіць не трэба, — папярэдзіў Нікас. — На першы раз дарую, але ведайце, што потым адразу будзе «бах-бах».

У гэты момант з мансарды праз увесь падворак пралегла чырвоная палоска лазернага прыцэла.

Казімірчык прабачальна зірнуў на таварышаў па няшчасці і папрасіў у гаспадара прынесці баскетбольныя мячы. Той натужна засмяяўся, ухваляючы такое рашэнне. Успыхнуў яшчэ адзін пражэктар, прамень якога быў скіраваны на іншую частку падворка. Там акурат стаяў слуп з баскетбольным кошыкам. З дому выйшаў чарговы граміла з прыхаваным пад маскай тварам. Абедзве яго рукі былі занятыя сеткамі з мячамі. Ён расставіў іх па розныя бакі ад пункта, з якога меркавалася здзяйсняць кідкі. Фатограф на правах гаспадара даў Арцёму магчымасць пачаць гэты двубой першым. Хлопец дастаў мяч. Падышоў на вызначаную лінію, глянуў на кальцо і зрабіў маланкавы кідок. Мяч дасканала трапіў у кошык. Настала чарга Сулімава. Пазіраючы з ухмылкай на суперніка, ён слепа кінуў мяч у бок кальца. Кідок атрымаўся трапным. Наступныя кідкі былі паспяховымі ў абодвух. Калі дайшла чарга да трэцяга (і апошняга) кідка, Арцём зразумеў, што ўзяты ім мяч мае зрушаны цэнтр цяжкасці. Ён паведаміў пра гэта Нікасу. Той і слухаць нічога не стаў: маўляў, мячыкі ўсе новыя, а што ў адным з іх раптам выявіўся брак, дык тое зусім не ягоны клопат. У хлопца не было сумневаў, што бракаваны мяч яму падсунулі наўмысна. Казімірчык яшчэ раз узважыў яго ў руках, злёгку падкінуў і злавіў. Спрабаваў разлічыць, як ён будзе ляцець. У гэтым вельмі лёгка можна было памыліцца. Максімальна сканцэнтраваўся і зрабіў кідок. Мяч ударыўся зверху аб вобад кальца, падскочыў, ударыўся аб шчыт, зваліўся назад на вобад, а ўжо адтуль трапіў у кошак. Баскетбаліст трыумфаваў. Хтосьці ўздыхнуў з палёгкай. Гаспадар дома працягваў ухмыляцца, быццам трэці закінуты канкурэнтам мяч мала што значыў. Ён падступіўся да лініі, трохі памарудзіў і ўрэшце шпурнуў мяч. Траекторыя палёту была заведама пройгрышнай. Мяч стукнуўся ў бок вобада і адскочыў. Фатограф прайграў.

— Мае віншаванні, — з нязводным крыўляннем вымавіў ён. — Ну, што? Ты хочаш бачыць Святлану?

— Так. Вы ж абяцалі.

— Я абяцаў. Мая тэрыторыя — мае правілы. Хачу прызначаю, а хачу змяняю, — нахабна заявіў Сулімаў.

Палоска лазернага прыцэла перамясцілася на Казімірчыка. Знайдзёнаў, улавіўшы гэты момант, рэзка скочыў, каб захінуць юнака ад стрэлу. Тады стрэл і прагучаў. Дакладней, гэта быў хлапок. Мількавец ускрыкнула. А вось хлопцы здзіўлена пераглянуліся, і з вуснаў збянтэжанага капітана сарвалася безадраснае пытанне: «Ружжо для пейнтбола?» Арцём зірнуў на спіну настаўніка. Там сапраўды красавала пляма ад фарбы. Баскетбаліст недаўменна паглядзеў на Нікаса. У тое самае імгненне ўвесь падворак асвяціўся ліхтарамі. А прамяні пражэктараў скіраваліся на тую яго частку, якая дагэтуль знаходзілася ў поўнай цемры. Праз секунду уверх паляцелі ракеты феерверку. Дзякуючы святлу, можна было ўбачыць вялікі плакат, які быў прымацаваны над агароджай. На плакаце была фатаграфія Даброўскай, якая іранічна ўсміхалася. Ніжэй красаваў надпіс: «Мая сціплая просьба да цябе: “Кінь мяне раўнаваць, мілы!”». Знайдзёнаў, убачыўшы гэта, стаў гучна смяяцца. Меркаваў, што ўсё зразумеў. «Як жа ж ты не здагадалася першай? Тут жа гісторыя блізкая да тваёй любімай гісторыі са сторублёўкай пачатку XX стагоддзя», — усмешліва заўважыў ён аспірантцы. Тая таксама ўсміхнулася і чыста па-сяброўску дала яму лёгкага плескача па плячы. Ён пераняў яе руку і пацягнуў да сябе, каб заключыць у абдымкі. Аксана не дужа супраціўлялася гэтаму. Грамілы паскідвалі маскі і форму, дзякуючы спецыфічнасці якой яны, уласна, грамiламі і здаваліся. Сярод іх нечакана аб’явілася і парачка «схваткаўцаў». Казімірчык глядзеў на ўсё гэта з разяўленым ротам і акругленымі вачыма. Ён ніяк не мог зразумець, што адбываецца. На вялікім балконе зайграла жывая музыка. З катэджа выйшла Света ў прыгожай белай сукенцы. Яна ўсміхалася дакладна так, як і на плакаце. Іранічнасці ва ўсмешцы Сулімава было яшчэ больш, а яго твар ззяў прыязнасцю.

— Ты будзеш мяне раўнаваць? — спытала Даброўская ў свайго хлопца.

— Дык гэта ўсё ты сама зладзіла? — спытаў наўзаем ён.

— У нечым сама. У нечым з дапамогай Нікаса. Ён вельмі добры актор. Тваіх сяброў па «Схватцы» параканалі дапамагчы ўжо тут, — гаварыла дзяўчына, гледзячы яму проста ў вочы. — Але ты не адказаў на маё пытанне.

— Хочаш сказаць, што ўвесь цырк быў разыграны толькі для таго, каб змусіць мяне перастаць раўнаваць?

— Так. Ты ж слепнеш, калі раўнуеш, — не злосна, з роспаччу ў голасе мовіла Света. — Напрыклад, сёння ты мяне тут ужо бачыў. Але варта было мне сказаць, што я — гэта не я, як ты паверыў.

— Ты сапраўды не была падобнай на сябе, — стаў апраўдвацца юнак.

— Так. Быў грым. Праўда, сутнасці гэта не змяняе, — дзяўчына па-ранейшаму не зводзіла вачэй з раўнівага сябра. — Гульня, ці як ты сказаў — цырк, магла б і не адбыцца, калі б ты быў больш уважлівым. Але рэўнасць засціла табе вочы, і гульня мусіла працягнуцца. Ты нават не заўважыў, што па дарозе некалькі разоў бачыў білборды з маёй фатаграфіяй… Гэты ход з «сацыяльнай рэкламай» прыдумаў Нікас.

— А хто аплаціў? І хто яшчэ быў свядомым удзельнікам тваёй гульні? Ці толькі мяне трымалі за сляпое шчанятка? — спытаў баскетбаліст, не наважваючыся зрабіць адзін крок наперад.

— Аплаціў тата, — тлумачыла Даброўская. — Я падбіла яго на гэта. Ён мог бы мне зрабіць добры падарунак з нагоды заканчэння школы. Але я вырашыла, што прыцягненне тваёй увагі для мяне значыць болей. Усе ж астатнія — і Віктар Андрэевіч, і яго нявеста, і Насця з Кацяй не былі ў курсе.

Арцём збянтэжана азірнуўся на пару гісторыкаў і недаверліва ўдакладніў:

— Дык вы жаніх і нявеста?

— Так, — на двуспеў адказалі яны, стоячы ў абдымку.

— Вось бачыш, ты столькі часу сёння прабавіўся ў іх кампаніі, і нічога такога не ўгледзеў, — заўважыла плыўчыха.

— Ды я быў падбіты тваім знікненнем! — з роспаччу прамовіў баскетбаліст. — Мне было не да назіранняў. А ўвогуле, навошта было ўсё гэта ладзіць? Няўжо ты не магла проста ўзяць і паразмаўляць са мной пра гэта? Чаму спатрэбілася цэлая гульня?

— Ты ж ведаеш, што простая размова не да чаго б не прывяла. Колькі мы з табой пра гэта гаварылі раней? І чым яно ўсё заканчвалася? Я ўжо не ведала, як табе яшчэ можна было патлумачыць, каб ты, нарэшце, разумеў, што я кахаю толькі цябе і нікога іншага. Што раўнаваць мяне да каго б там ні было папросту не варта. Вось дзеля гэтага я ўсё і распачала.

Збоку нешта шчоўкнула. Казімірчык павярнуў галаву і кінуў позірк на фатографа. Той зноў стаяў з фанабэрыстым тварам, а ў руцэ трымаў пісталет, скіраваны на Арцёма.

— Ну, досыць ужо. «Свіданка» завяршылася, — па-нахабніцку звярнуўся гаспадар дома да хлопца і дзяўчыны. — Цяпер прыспеў час развітацца.

Усё прысутныя вырачылі вочы, не разумеючы, што дзеецца. Сулімаў выпрастаў руку, у якой трымаў пісталет, і націснуў на курок. Стрэлу не адбылося. З пісталетнага дула выскачыў стракаты сцяжок з яркім надпісам «BANG!». Нікас ціха засмяяўся, а следам за ім засмяялася Света. Гэты момант з пісталетам таксама быў часткай іх гульні.

— Паслухай, малы, — прамаўляў фатограф да Казімірчыка. — Яна цябе яшчэ доўга павінна ўпрошваць? Павер мне, не многія жанчыны адважыліся б на падобную авантуру дзеля любімага чалавека. А ты ўсё не верыш і манежышся.

Хлопец упершыню за ўвесь час знаходжання на падворку ўсміхнуўся. Ён павярнуўся тварам да Светы і сказаў ёй:

— Маім адказам на тваю сціплую просьбу будзе: «Больш ніякай рэўнасці!»

— Даўно б так, — адказала яна, засвяціўшыся чароўнай усмешкай.

Закаханыя, нарэшце, абняліся і пацалаваліся. Прысутныя ажно адарылі іх воплескамі і радаснымі воклічамі. Арцём, на секунду адарваўшыся ад сваёй дзяўчыны, спытаў у Аксаны:

— Дык, а хто тую сторублёўку ўсё ж скраў?

— Самы час для такіх пытанняў, — падшпіліў юнака настаўнік.

— Ды ніхто яе не краў, — аспірантка з ахвотай узялася за тлумачэнне. — Гаспадар сам пераклаў яе ў іншае месца, а потым забыўся. Падняў шум на палову горада. А калі знайшоў, то нікому гаварыць не стаў. Пасаромеўся.

— Добра, што Света не пасаромелася пагаварыць, — усцешана заўважыў хлопец. — А то яшчэ сто гадоў да разгадкі я не дацягнуў бы.

— Дацягнуў бы з боскай дапамогаю і сілай кахання, — адказала яму на гэта дзяўчына.

Новыя воплескі прысутных не змусілі сябе доўга чакаць.